**СПАДЧЫНА** | Мазырскі драматычны тэатр адсвяткаваў 103-ю гадавіну з дня нараджэння Івана Мележа

# Наш анёл-захавальнік

**У тэатральна-музычнай кампазіцыі «Адна тысячная таго, што адчувае маё сэрца» былі паказаны самыя хвалюючыя сцэны са спектакля «Людзі на балоце» ў пастаноўцы галоўнага рэжысёра Рамана Цыркіна.**

Варта адзначыць, што ў 2021 годзе гэты спектакль прынёс тэатру адразу дзве ўзнагароды. На VI Рэспубліканскім конкурсе «Нацыянальная тэатральная прэмія» галоўны рэжысёр атрымаў дыплом лаўрэата ў намінацыі «Найлепшая работа рэжысёра ў спектаклі тэатра драмы», а артыст Міхаіл Кліменка – прэмію журы за ролю Халімона.

Іван Мележ – анёл-захавальнік мазырскага тэатра. Больш за паўстагоддзя прайшло, як пісьменнік пабываў у нашым калектыве, і 30 гадоў, як тэатр з гонарам носіць яго імя. Якім запомніўся Іван Паўлавіч, мы даведаліся ад былой артысткі Мазырскага народнага тэатра, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, кандыдата філалагічных навук, лаўрэата тэатральнага майстэрства 1967 года (за спектакль «Раскіданае гняздо», паказаны на крамлёўскай сцэне) Галіны Дашкевіч – нашай мазырскай Паўлінкі, Зоські, Хадоські. Яна прачытала свае вершы пра пісьменніка, успомніла водгук Мележа пра артыстаў народнага тэатра.

Мы маглі толькі марыць, каб на выставе, менавіта ў гэты дзень, у нас былі рэчы Івана Мележа і архіўныя матэрыялы. Дзякуючы дэлегацыі Хойніцкага райвыканкама на чале з загадчыкам сектара культуры Людмілай Лобан гэта стала явай. Навуковыя супрацоўнікі Хойніцкага краязнаўчага музея паказалі мазыранам рарытэтныя экспанаты: друкарскую машынку пісьменніка, партфель, берэт і фотадакументы, а Любоў Рубан, навуковы супрацоўнік Дома-музея Івана Мележа ў вёсцы Глінішча, расказала шмат цікавых падрабязнасцей з жыцця славутага палешука, якіх не знойдзеш у навуковай літаратуры, бо нарадзілася, вырасла і жыве яна на той зямлі, па якой хадзіў сам Мележ.

Вечар, прысвечаны Івану Мележу, – гэта сумесная праца тэатра з аддзелам адукацыі Мазырскага райвыканкама, бібліятэкай імя В. Харужай, фабрыкай мастацкіх вырабаў, дзіцячай школай мастацтваў № 2, раённай арганізацыяй «Белай Русі», аддзелам культуры Хойніцкага райвыканкама, а яшчэ са сваякамі пісьменніка, якія жывуць і працуюць у Мазыры.

Атрымаўся сапраўдны тэатральны праект, і мы, мележаўцы, вельмі ўдзячныя ўсім за вялікую дапамогу па ўшанаванні нашага славутага земляка, за прыхільнасць да нацыянальнай культуры і роднага беларускага слова! Давайце чытаць Мележа і перадаваць нашу слаўную літаратурную спадчыну будучым пакаленням!

**Таццяна АНДРЫЕЎСКАЯ,**
**кіраўнік літаратурна-драматургічнай часткі Мазырскага драматычнага тэатра імя Івана Мележа**